# ПРАДМОВА

...Дрэвы паміраюць,
Калі перастаюць пазнаваць
Змены года
І не адгукаюцца рэхам;
Вада — калі забывае,
Куды ёй плыць,
І нікому не спатольвае смагі;
Зямля — калі перастае
Радзіць хлеб
І быць калыскай песняў;
Чалавек — калі страчвае здольнасць
Здзіўляцца і захапляцца Жыццём.

*Максім Танк "Дрэвы паміраюць"*

Сучасная педагогіка ўвесь час знаходзіцца ў стане развіцця і шукае эфектыўныя адукацыйныя тэхналогіі, якія адначасова будуць спрыяць патрыятычнаму выхаванню, фарміраванню нацыянальнай самасвядомасці, выхоўваць гонар і павагу да роднага краю ў падрастаючага пакалення.

У адпаведнасці з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі дашкольная адукацыя з'яўляецца адным з узроўняў асноўнай адукацыі. Установа дашкольнай адукацыі — адзін з тыпаў устаноў адукацыі, педагагічная дзейнасць якой накіравана на вырашэнне адной з галоўных задач выхавання — фарміраванне ў дзяцей дашкольнага ўзросту ўяўленняў аб родным краі, станоўчых адносін да яго, далучэнне да агульначалавечых і нацыянальных каштоўнасцей, зацікавіць дзяцей пазнаннем гісторыі і культуры свайго народа, выхаваць гонар за сваю краіну, беларускі народ. Узбагаціць мову дзяцей творамі беларускага фальклора магчыма толькі пры наяўнасці зладжанай сістэмы работы, змест якой будзе складацца з розных форм і спосабаў арганізацыі, для рэалізацыі задач выкарыстоўваюцца шматлікія метады і прыёмы, сродкі выхавання.

Старшы дашкольны ўзрост з'яўляецца найбольш спрыяльным перыядам для фарміравання ўяўленняў аб родным краі, станоўчых адносін да яго, авалодання дзецьмі беларускай народнай культурай. Менавіта к шасці гадам у дзяцей фарміруецца даволі высокі ўзровень пазнавальнай дзейнасці. Выхаванцы здольны не толькі рашаць задачу ў наглядным плане, але і выканаць пераўтварэнне аб'екта, указаць, у якой паслядоўнасці аб'екты ўступаюць ва ўзаемасувязь. Асаблівасці псіха-фізічнага развіцця дзяцей 5–7 год прымушаюць педагогаў шукаць і ствараць такія адукацыйныя ўмовы, падчас

дзейнасці ў якіх зацікаўленасць да пазнання гісторыі і культуры беларускага народа ўзрастала. Таму перад педагогамі стала складаная задача — знайсці такі спосаб арганізацыі дзейнасці, падчас якой пазнавальная актыўнасць дзяцей была б на высокім узроўні, што будзе спрыяць раскрыццю багацця і непаўторнасці роднага краю, знаёміць з яго гісторыяй, дапаможа дзіцяці ўсвядоміць і адчуць сябе неад'емнай часткай гэтай прыгожай зямлі, цудоўнага народа.

Значная ўвага па рэалізацыі задач дадзенага накірунку педагогамі-навукоўцамі (Г. П. Арлова, А. А. Грымаць, Д. М. Дубініна, Л. М. Варанецкая, У. А. Васілевіч, Н. С. Старжынская і інш.) і педагогамі-практыкамі надаецца пры арганізацыі спецыяльна арганізаванай дзейнасці па адукацыйным галінам "Дзіця і грамадства", "Развіццё маўлення і культура маўленчых зносін", "Выяўленчае мастацтва", "Мастацкая літаратура".

Аднак на сучасным этапе развіцця сістэмы дашкольнай адукацыі актуальным становіцца выкарыстанне метада праектаў і рэалізацыя тэматычных тыдняў. Мэтазгоднасць планавання адукацыйнага працэса праз інтэграцыю метада і формы арганізацыі дзейнасці звязана з вялікім патэнцыялам у развіцці пазнавальнай актыўнасці дзіцяці.

Метад праектаў у арганізацыі дзейнасці дзяцей па фарміраванні ўяўленняў аб родным краі, станоўчых адносін да яго, далучэнні да агульначалавечых і нацыянальных каштоўнасцей педагогамі устаноў дашкольнай адукацыі не выкатыстоўваецца. Гэта звязана з адсутнасцю практыка-арыентаванай метадычнай літаратуры, дапаможнікаў, наяўнасць якіх дазволіла б праводзіць работу паэтапна, з асновай на інтэграцыйны падыход.

У дапаможніку прадстаўлены тэматычныя тыдні і праекты, як форма арганізацыі работы з дзецьмі, якія распрацаваны ў адпаведнасці з задачамі вучэбнай праграмы дашкольнай адукацыі і структураваны па асноўных кампанентах праекта: мэта, задачы, прадугледжаныя вынікі, этапы работы, прыкладны практычны матэрыял. Змест праектаў адпавядае асаблівасцям псіха-фізічнага развіцця дзяцей старшага дашкольнага ўзросту (5–7 год). Прынцыпы інтэграцыі зместу адукацыйных галін і інтэнсіфікацыі засваення інфармацыі, пакладзеныя ў аснову праектнай дзейнасці, дапамогуць педагогу фарміраваць у дзяцей першапачатковыя ўяўленні аб гісторыі ўзнікнення і развіцця Рэспублікі Беларусь, славутасцях роднага краю. Адзіны алгарытм рэалізацыі тэматычных тыдняў і праектаў, разнастайныя формы арганізацыі работы з выхаванцамі, далучэнне бацькоў да сумеснай работы с дзецьмі і педагогамі ўзмацняць эмацыйна-пазнавальныя ўяўленні дзіцяці

будуць дадаткова матываваць яго да авалодання роднай мовай, далучэння да беларускай культуры. Выкарыстанне твораў вуснай народнай творчасці (вершыкаў, загадак, скарагаворак, песенак, калыханак і інш.) служыць для пашырэння слоўнікавага запасу выхаванцаў, глыбей пазнаёміць з асаблівасцямі роднай мовы. Усё гэта дазволіць педагогу граматна ажыццяўляць працэс фарміравання ўяўленняў аб родным краі, станоўчых адносін да яго дзяцей дашкольнага ўзросту, знаёміць з асноўнымі асаблівасцямі беларускай культуры, развіваць пазнавальную актыўнасць. Узаемадзеянне педагога з музычным кіраўніком, з кіраўніком фізічнага выхавання, з бацькамі на розных этапах работы над праектам дапаможа развіваць пазнавальныя, маўленчыя, творчыя здольнасці дзяцей.

Распрацаваны матэрыял апрабіраваны падчас рэалізацыі інавацыйнага праекта “Укараненне мадэлі арганізацыі працэса патрыятычнага выхавання дзяцей дашкольнага ўзросту ва ўстанове дашкольнай адукацыі” на базе дзяржаўнай установы адукацыі “Дашкольны цэнтр развіцця дзіцяці № 214 г. Мінска”.

# АРГАНІЗАЦЫЯ ПРАЦЭСА ПАТРЫЯТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ ДЗЯЦЕЙ ДАШКОЛЬНАГА ЎЗРОСТУ МЕТАДАМ ПРАЕКТАЎ

Сучаснае жыццё любой нацыі даказвае неабходнасць фарміравання нацыянальнай самасвядомасці, выхавання патрыятычных пачуццяў ужо з дашкольнага ўзросту. Сёння пытанні фарміравання ўяўленняў пра родны край і адносін да яго, зварот да традыцый беларускага народа, выкарыстанне педагогамі сродкаў народнай педагогікі вельмі актуальны. Аналіз тэорыі і практыкі ў галіне нацыянальнага развіцця і патрыятычнага выхавання паказвае, што традыцыйныя формы, якія выкарыстоўваюцца ў дашкольных установах, патрабуюць дапаўнення сучаснымі інавацыйнымі тэхналогіямі. Таму асобую ўвагу неабходна надаць арганізацыі актыўных відаў дзіцячай дзейнасці, у якой яны папоўняць асабісты вопыт для паспяховага пераноса ў жыццё рэальнае, на практыку. Дзіця дашкольнага ўзросту мысліць канкрэтна, яно павінна выканаць пэўныя заданні, а не апераваць абстрагаванымі паняццямі. У гэтым сэнсе найбольш эфектыўна і мэтазгодна арганізацыя праектнай дзейнасці. Перспектыўнасць выкарыстання метада праектаў, як спосаба арганізацыі дзейнасці дзяцей, якая пабудавана на аснове іх інтарэсаў, на актыўным удзеле ў яе планаванні і рэалізацыі, асноўваецца на прызнанні самакаштоўнасці нацыянальнай культуры беларускага народа.

Мэтазгоднасць выкарыстання метада праектаў у дашкольнай адукацыі звязана з яго вялікім патэнцыялам у фарміраванні ўяўленняў пра родны край і развіццё пазнавальнай актыўнасці дзіцяці. Адзін з спосабаў вызваць такую актыўнасць — гэта пабудаваць працэс пазнання вакол асобнай праблемнай сітуацыі, якая прадстаўляе асабовы інтарэс для выхаванца і падтрымлівае дзіця ў сумесным з дарослым ці самастойным пошуке яе вырашэння.

Тэматычны праект — гэта сродак, з дапамогай якога педагог рашае задачы выхавання і навучання дзяцей дашкольнага ўзросту ў межах адной тэмы. Агульны характар гэтых тэматычных праектаў вызначаецца асноўнымі прынцыпамі вучэбнай праграмы дашкольнай адукацыі, у рамках якой яны рэалізуюцца.

Тыпы праектаў з дзецьмі 5–7 год могуць быць даследчымі, пазнавальна-творчымі, гульнявымі, казачнымі. Аснову форм і метадаў работы з дзецьмі ў рамках тэматычнага праекта складаюць творчыя заданні, дыдактычныя гульні, гульні-драматызацыі, інтэграваныя і комплексныя заняткі, народныя рухомыя гульні, фальклорныя святы, экскурсіі, сістэма работы з творамі вуснай народнай творчасці:

беларускімі народнымі казкамі, песенькамі, загадкамі, забаўлянкамі, народнымі прыказкамі, прымаўкамі, прыкметамі (расказванне, тэатралізацыя, гутаркі, праблемныя сітуацыі, падгрупавыя і індывідуальныя заданні, творчыя работы сумесна з бацькамі) і г. д.

Выкарыстанне метада праектаў у адукацыйным працэссе дазваляе павысіць эфектыўнасць у галіне нацыянальнага развіцця, так як ён звязан з развіваючым, асабіста-арыентаваным навучаннем. Праект дазваляе інтэгрыраваць звесткі з розных абласцей праграмы дашкольнай адукацыі дзеля вырашэння адной праблемы і прымяніць яе на практыцы. Працуя па метаду праекта, выхавацель ажыццяўляе педагагічнае суправаджэнне дзіцяці ў дзейнасці па пазнанню гісторыі, культуры і мовы беларускага народа.

Уключэнне метада праектаў у дашкольнай установе адбываецца паступова. Першапачаткова работа арганізуецца на ўзроўні адной групы: ад заняткаў па адукацыйным галінам "Дзіця і грамадства", "Выяўленчае мастацтва", "Музычнае мастацтва", "Развіццё маўлення і культура маўленчых зносін" з уключэннем праблемных сітуацый да арганізацыі сумеснай дзейнасці дзяцей і выхавацеля, дзяцей і бацькоў у форме тэматычных тыдняў і праектаў (групавых, індывідуальных, кароткачасовых, доўгачасовых).

Работа па метаду праектаў будуецца з некалькіх этапаў:

- пастаноўка мэты, улічваючы інтарэсы дзяцей;
- далучэнне дзяцей да рашэння праблемы (вызначэнне дзіцячай мэты);
- складанне плана дасягнення мэты;
- абмеркаванне плана з дзецьмі і бацькамі, мадэляванне плана-схемы праекта, размяшчэнне яго на відным месцы;
- правядзенне мерапрыемстваў асноўнай часткі праекта (заняткі, назіранні, экскурсіі, хатнія заданні дзяцей з бацькамі, гутаркі, самастойная творчая работа дзяцей);
- арганізацыя прэзентацыі праекта (свята, акцыя, адкрытае мерапрыемства, афармленне выставы, кнігі, альбома);
- падвядзенне вынікаў (выступленне на педагагічным сходзе, круглы стол, "педагагічная майстэрня").

Тэмы праектаў абмяркоўваюцца з дзецьмі, што дазваляе стварыць станоўчую матывацыю да дзеянняў. Дзеці з задавальненнем уключаюцца ў праекты, якія звязаны з гісторыяй прадметаў, мясцін, асаблівасцямі прыроды роднага краю, культуры.

Змест патрыятычнага выхавання і развіцця нацыянальнай самасвядомасці будуецца на аснове ўяўленняў пра родны край і адносін да яго: гісторыі, культуры, мовы, — таму асноўнымі тэмамі праектаў могуць стаць:

| **Від, тып праекта** | **Назва праекта** |
|---|---|
| Пазнавальна-творчы, групавы, доўгачасовы | "Падарожжа па сцяжынках гісторыі Беларусі"<br>"Сімвалы Беларусі"<br>"Славутыя мясціны Беларусі" |
| Камунікатыўны, групавы, кароткачасовы | "Знакамітыя людзі, якія праславілі Беларусь"<br>"Дзяржаўныя і народныя святы Беларусі"<br>"Народныя промыслы і мастацтва"<br>"Чараўніцтва беларускай народнай творчасці" |
| Мастацка-эстэтычны, групавы, кароткачасовы | "Беларуская народная цацка"<br>"Беларуская кніга"<br>"Родны горад"<br>"Беларуская народная казка"<br>"Белавежская пушча"<br>"Беларускі нацыянальны строй" |
| Гульнявы, групавы, кароткачасовы | "Беларуская хатка"<br>"Батлейка. Старажытны і сучасны лялечны тэатр"<br>"Народныя прыкметы, казкі, загадкі" |
| Даследчы, індывідуальны, кароткачасовы | "Чаму на сцягу Беларусі выяўлены арнамент?" |

Дзеці старшага дашкольнага ўзросту могуць прапанаваць тэматыку праектаў у адпаведнасці з жаданнем і ўзроўнем развіцця, пры гэтым улічваюцца іх схільнасці (даследчыя, працоўныя, мастацкія і інш.). Акрамя таго, падчас правядзення праекта можа з'явіцца неабходнасць у ажыццяўленні індывідуальных праектаў, заснаваных на асабістай зацікаўленасці дзяцей, сям'і.

Неабходна вылучыць наступныя станоўчыя аспекты работы па метаду праектаў:

- работа па праекту праводзіцца пры наяўнасці інтарэса і жадання ў дзяцей, а навучанне паспяхова тады, калі яно прыносіць задавальненне, мае пазітыўную матывацыю;
- падчас дзейнасці праект можа дапаўняцца новымі індывідуальнымі "міні-праектамі", якія ўлічваюць запатрабаванні дзяцей;
- працэс атрымання ведаў, навыкаў і здольнасцей у дзяцей адбываецца ў розных відах дзейнасці;
- дзеці маюць магчымасць адчуваць сябе самастойнымі асобамі, якія могуць разважаць, думаць і праяўляць свае веды і ўменні;
- працуючы сумесна, яны вучацца прымаць чужую кропку погляду, пачынаюць самі думаць і разважаць крытычна, калі апісваюць свае ідэі;

# ДАДАТАК 2
# ДАСЛЕДАВАННЕ “ЧАМУ НА СЦЯГУ БЕЛАРУСІ ВЫЯЎЛЕНЫ АРНАМЕНТ?”

### Даследаванне выхаванкі старшай групы Главінскай Ксеніі, 6 год (матэрыялы Рэспубліканскага конкурса даследчых прац дзяцей дашкольнага ўзросту “Я — даследчык”, намінацыя “Мая Радзіма Беларусь”)

***Мэта:*** вызначыць, чаму на сцягу Беларусі выяўлены арнамент.

***Гіпотэза:*** арнамент выяўлены на сцягу Беларусі дзеля яго ўпрыгожвання, адрознення яго ад сцягаў іншых краін.

***План работы:***

1. Збор інфармацыі: гутарка з выхавальнікам, пошук інфармацыі ў энцыклапедыі, у інтэрнэце.
2. Параўнанне элементаў беларускага арнаменту на прадметах рукатворнага свету.
3. Вывучэнне і аналіз значэння элементаў беларускага арнаменту ў гісторыі Беларусі.
4. Апрацоўка вынікаў даследавання. Фармуляванне высноў.
5. Прэзентацыя вынікаў даследавання для дзяцей.

***Умовы правядзення даследавання і сродкі дасягнення пастаўленай мэты:*** экскурсія ў музей (экспанаты з арнаментамі), гульня з лэпбукам (дзяржаўныя сімвалы), наведванне бібліятэкі (энцыклапедыя “Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва Беларусі”), інтэрнэт, аповед выхавальніка, бацькоў.

### Расказ Ксеніі Главінскай, выхаванкі старшай групы

У групе мы гулялі з лэпбукам. Я даведалася, што сцяг, герб і гімн — гэта дзяржаўныя сімвалы нашай краіны. Калі мы разглядалі сцягі іншых краін, заўважыла, што на нашым сцягу, акрамя чырвонай і зялёнай паласы ёсць яшчэ арнамент, а на сцягах іншых краін яго няма.

Галіна Сяргееўна сказала, што ў Беларусі з даўніх часоў арнаментам упрыгожвалі прадметы рукатворнага свету: рушнікі, адзенне, цацкі, посуд.

Я зацікавілася: навошта на сцягу нашай краіны выяўлены арнамент, — і мы пайшлі ў музей.

Аказалася, што арнамент можа быць розным: раслінным — на ім вышыты кветкі, расліны, геаметрычным — квадраты, ромбы, лініі, зігзагі. Заўважылі, што нават раслінны арнамент складаецца з геаметрычных фігур, у асноўным, ромбікаў (Фотаматэрыялы, Дадатак 1).

# ЗМЕСТ

**Прадмова** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 1
**Арганізацыя працэса патрыятычнага выхавання дзяцей дашкольнага ўзросту метадам праектаў** . . . . . 4
**Прыкладнае планаванне**
Тэматычны праект “Падарожжа па сцяжынках гісторыі Беларусі” . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 13
Тэматычны праект “Сімвалы Беларусі” (другі тыдзень мая) . . . . 30
Тэматычны праект “Вядомыя мясціны Беларусі” . . . . . . . . . . 42
Тэматычны праект “Славутыя імёны зямлі беларускай” . . . . 60
Тэматычны праект “Дзяржаўныя і народныя святы Беларусі: Дзень Незалежнасці Беларусі. Купалле” (канікулы, першы тыдзень ліпеня) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 78
Тэматычны праект “Чароўны свет беларускай народнай творчасці” (студзень, зімовыя канікулы) . . . . . . . . . . . . . . 87
Тэматычны праект “Беларускія народныя промыслы і мастацтва” . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 101
Тэматычны праект “Здаровы я — здаровая краіна!” . . . . . . . 119
Тэматычны праект “Беларусь спартыўная” . . . . . . . . . . . . . 136
Тэматычны праект “Наш любімы дзіцячы сад” . . . . . . . . . . . 152
**Дадатак 1**
Канспекты спецыяльна арганізаванай дзейнасці з дзецьмі 5–7 год . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 166
Ток-шоу: Дзяржаўныя святы Рэспублікі Беларусь . . . . . . . . . 166
Тэма: Вядомыя людзі Беларусі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 172
Тэма: Сімвалы Беларусі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 178
Тэма: Беларускія вячоркі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 183
Тэма: Падарожжа па знакамітых мясцінах Беларусі . . . . . . . 186
Тэма: Кірмаш — свята творчасці. Вольны час з дзецьмі старшага дашкольнага ўзросту (5–7 год) . . . . . . . . . . . . . . 191
Тэма: Беларускія народныя святы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 196
**Дадатак 2**
Даследаванне “Чаму на сцягу Беларусі выяўлены арнамент?” . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 200
**Спіс рэкамендуемай літаратуры** . . . . . . . . . . . . . . . . . . 203
Фотаматэрыялы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 206